УДК 94(476):331.108

# ГРАМАДСКАСЦЬ У БАРАЦЬБЕ СА ЗЛАЧЫННАСЦЮ І ЗА ЎМАЦАВАННЕ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ СЯРОД РАБОТНІКАЎ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР У 1970–1980-Я ГГ.

**І. А. Пушкін**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій,
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

***Анатацыя.*** *У артыкуле асвятляюцца праблемы росту злачыннасці і нізкай працоўнай дысцыпліны на прамысловых прадпрыемствах Савецкай Беларусі ў 1970–1980-х гг. Паказаны ўдзел грамадскасці ў дзейнасці народных дружын, таварыскіх судоў, структур народнага кантролю.*

***Ключевыя словы:*** *Савецкая Беларусь, БССР, персанал, злачыннасць, працоўная дысцыпліна, народны кантроль, таварыскі суд, народная дружына.*

***Annotation.*** *The article highlights the problems of rising crime and low labor discipline at industrial enterprises of Soviet Belarus in the 1970-1980s. The participation of the public in the activities of people's squads, comrades' courts, and structures of people's control is revealed.*

***Keywords:*** *Soviet Belarus, BSSR, personnel, crime, labor discipline, people's control, comradely court, people's squad.*

Наша мэта — праанализаваць удзел савецкай грамадскасці ў барацьбе са злачыннасцю і ўмацаванне працоўнай дысцыпліны сярод работнікаў прамысловых прадпрыемстваў БССР у 1970–1980-я гг. – апошнія дзесяцігоддзі існавання Савецкай Беларусі, перыяд пачатку палітычных трансфармацый і эканамічных рэформ. Прававая культура насельніцтва, падлеткавая злачыннасць і неправамерныя дзеянні кіраўнікоў раскрыты ў некаторых публікацыях аўтара [1; 2; 3]. Але сітуацыя ў БССР у поўным аб'ёме не раскрыта, што і абумоўлівае актуальнасць даследавання.

Праблемы злачыннасці на прамысловых прадпрыемствах і працоўнай дысцыпліны закранулі ў савецкі час практычна ўсе сферы дзейнасці і моцна хвалявалі партыйна-савецкае кіраўніцтва. Парадаксальна, грамадства негатыўна ставілася да падобных адмоўных праяў у жыцці, але пры гэтым сярод работнікаў былі шырока распаўсюджаны выказванні: «на работе ты не гость, унеси хотя бы гвоздь», «усё вакол калгаснае, усё вакол маё».

Эканоміка БССР несла значныя страты ад дробных («несуны») і буйных крадзяжоў, растрат і нястач. Так, напрыклад, за 1971–1975 гг. страты ад іх склалі па Гродзенскай вобласці звыш за 1,5 млн рублёў [4, арк. 44]. У г. Оршы за 9 месяцаў 1976 г. было ўзбуджана 294 справы супраць раскрадальнікаў дзяржаўнай і грамадскай маёмасці [5, арк. 55–57]. У 1981–1983 гг. за крадзяжы прадукцыі ў ВА «Бабруйскшына» прыцягнулі да крымінальнай адказнасці

180 чалавек [6, арк. 4] Назіраўся рост колькасці дробных крадзяжоў, толькі па Гродзенскім ВА малочнай прамысловасці (1984 г.), на гармалзаводзе ў Гродна, Слонімскім, Смаргоньскім і Скідзельскім масласырзаводах [7, арк. 28]. За восем месяцаў 1984 г. у г. Крычаве здзейснілі дробныя крадзяжы: мясакамбінат — 96 чалавек, ВА «Крычаўцэментшыфер» — 14, завод гумавых вырабаў — 9, маслазавод — 8, хлебазавод — 18, піўзавод — 6, іншыя — 20 [1, с. 150–151]. Прасочвалася тэндэнцыя не да скарачэння, а да павелічэння колькасці крадзяжоў.

Характэрным для таго часу з’яўляецца заключэнне начальніка аддзялення АБКСУ (ОБХСС) УУС Гродзенскага аблвыканкама. Ён адзначыў, што ў 1983 і ў першым квартале 1984 гг. на шэрагу заводаў харчовай прамысловасці вобласці не выявілі дробных крадзяжоў і засведчыў: «Гэты факт сведчыць не аб адсутнасці крадзяжоў на названых прадпрыемствах, а аб неналежным стане прапускнога рэжыму, слабым кантролі з боку адміністрацыі і начальнікаў цэхаў і ўчасткаў за работай падначаленых» [8, арк. 33].

Праблема працоўнай дысцыпліны ў індустрыяльным комплексе Беларусі пачала абвастрацца з пачатку 1970-х гг. Напрыклад, у 1970 г. на прадпрыемствах г. Оршы здзейснілі прагул 1 619 чалавек, або ў 2,4 разы больш, чым у 1969 г. Прагулы склалі 6 304 чалавека-дзён [9, арк. 20–21]. У г. Наваполацку — 1 180 чалавека-дзён [10, арк. 64, 86]. На Магілёўскім ліфтабудаўнічым заводзе ў 1971 г. мела месца 752 чалавека-дні прагулаў [11, арк. 26–27]. За 1974 г. на прамысловых прадпрыемствах г. Оршы страты працоўнага часу за год склалі 24 733 чалавека-дні. Гэта як больш за 100 чал. не працавалі на працягу ўсяго года [12, арк. 240]. У 1983 г. за прагулы і іншыя парушэнні ў БССР было звольнена 6 000 маладых рабочых. У студзені – верасні 1984 г. кожны трэці прагул, другое спазненне на працу былі дапушчаны юнакамі і дзяўчатамі [13, с. 392]. У 1988 г. на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці страты працоўнага часу ў выніку прагулаў у параўнанні з папярэднім годам павялічыліся на 15,5 % [14, арк. 54].

Каб паменшыць узровень злачыннасці і ўмацаваць працоўную дысцыпліну, на прамысловых прадпрыемствах прыкладаліся намаганні як з боку ўладных структур, так і кіраўніцтва прамысловых прадпрыемстваў БССР. Але не паўсюль і не заўжды кіраўнікі паслядоўна і сістэматычна праводзілі працу па папярэджанні і недапушчэнні правапарушэнняў работнікамі прадпрыемстваў. Не ва ўсіх працоўных калектывах была створана абстаноўка асуджэння і нецярпімасці да раскрадальнікаў дзяржаўнай уласнасці. Прычым сітуацыя не мянялася на працягу дзесяцігоддзяў. Прадстаўнічыя і выканаўчыя органы ўлады былі заклапочаны падобным становішчам і небяспечнай тэндэнцыяй, што неаднаразова стала прадметам разгляду на бюро ЦК КПБ, камісіях абласных,

гарадскіх і раённых саветаў, пасяджэннях адпаведных выканкамаў. Партыйна-савецкае кіраўніцтва звязвала парушэнні працоўнай дысцыпліны не з вытворчымі і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі працы, а з недастатковым выкарыстаннем усяго арсенала выхаваўчых сродкаў.

У лютым 1980 г. у БССР былі зацверджаны мерапрыемствы, скіраваныя на паляпшэнне выкарыстання рабочага часу, павышэнне арганізаванасці і дысцыпліны, стварэнне неабходных умоў для вытворчай працы. У першай палове 1980 г. прайшоў грамадскі агляд выкарыстання рабочага часу ў БССР. У рэспубліцы разгарнулася індывідуальная работа з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны. У 1981 г. яе праводзілі каля 26 000 чалавек партыйнага і прафсаюзнага актыву [13, с. 391]. Тым не менш узровень працоўнай дысцыпліны не паўсюль адпавядаў патрабаванням вытворчасці, а гэта ўплывала на тое, што многія прадпрыемствы не выконвалі своечасова планавыя заданні, прыбягалі да штурмаўшчыны ў апошнія дні месяца.

Асноўны цяжар барацьбы са злачыннасцю наогул і на прадпрыемствах у прыватнасці неслі праваахоўныя органы. Але ў савецкі час было шырока распаўсюджана меркаванне, што ў барацьбе са злачыннасцю і правапарушэннямі, умацаванні працоўнай дысцыпліны вялікую ролю адыграе грамадскасць шляхам далучэння працоўных у дзейнасць розных кантралюючых структур. Паўсюдна ствараліся добраахвотныя народныя дружыны, грамадскія суды, саветы прафілактыкі, народны кантроль (НК) і інш.

Так, у 1970-я гг. у Бабруйску налічвалася больш за 80 народных дружын, якія згуртавалі каля 4 тыс. дружыннікаў. Сярод іншага яны ўдзельнічалі ў мерапрыемствах па недапушчэнню крадзяжоў дзяржаўнай уласнасці. Народныя дружыны былі створаны на 70 прамысловых прадпрыемствах. Лепшымі былі дружыны вагавага завода (за 1972 г. затрымалі 100 правапарушальнікаў), завода імя Леніна (143 правапарушальнікі), мясакамбіната, вопытна-механічнага завода, аўтабазы № 13 [1, с. 259–260].

Пэўны ўплыў аказвалі таварыскія (грамадскія) суды. Толькі на тэрыторыі Кастрычніцкага раёна горада Магілёва існавалі 115 таварыскіх судоў. Шэраг з іх дзейнічалі фармальна, але большасць працавала добрасумленна. Шмат спраў за крадзяжы, здзейсненыя «несунамі», разгледзелі суды мясакамбіната і хлебакамбіната [15, арк. 277]. Прынцыповасцю адзначаліся таварыскія суды: Бабруйскага гарбарнага завода, ФанДока, які разгледзеў 102 справы [1, с. 260].

Істотную ролю адыграла грамадскасць праз удзел у структурах камітэтаў народнага кантролю (далей — КНК). Вярхоўны Савет СССР 30 лістапада 1979 г. прыняў Закон «Аб народным кантролі ў СССР». Адной з задач органаў народнага кантролю было ўмацаванне дзяржаўнай дысцыпліны і сацыялістычнай законнасці.

У 1981 г. у БССР дзейнічала 27 800 груп і 11 946 пастоў народнага кантролю, у якія было абрана 386 734 народныя кантралёры. У КНК на грамадскіх пачатках працавала амаль 16 тыс. пазаштатных інспектараў. Народныя кантралёры (далей — НК) ажыццяўлялі пастаянны кантроль за выкананнем дзяржаўных планаў і заданняў прадпрыемствамі і ўстановамі, захаваннем законнасці, вялі барацьбу з бюракратызмам, магчымым ашуканствам дзяржавы, дапамагалі ўмацоўваць працоўную дысцыпліну ў народнай гаспадарцы.

За 1972 г. НК толькі ў Бабруйску правялі 106 праверак. За недахопы і праступкі прыцягнулі да адказнасці 61 пасадавую асобу [1, с. 260]. Гродзенскім абласным КНК у 1975 г. за нядобрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў, парушэнні дысцыпліны, безгаспадарчасць, марнатраўства і бюракратызм прыцягнулі да адказнасці 904 службовыя асобы [16, арк. 141]. З 440 прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, будаўнічых арганізацый Гродзенскай вобласці, правераных органамі КНК у 1979 г. і за 5 месяцаў 1980 г., у 205 (46,6 %) былі выяўлены прыпіскі і іншыя скажэнні справаздачнасці [17, арк. 165]. У першай палове 1984 г. Гомельскія КНК праверылі 13 прадпрыемстваў Гомельскага ВА малочнай прамысловасці. Выявілі недахоп гатовай прадукцыі на Веткаўскім, Камарынскім, Нараўлянскім і Лельчыцкім маслазаводах, Гомельскім малочным камбінаце; вялікую колькасць дробных крадзяжоў прадукцыі (160 выпадкаў) на Гомельскім малочным камбінаце, Добрушскім заводзе сухога абястлушчанага малака, Калінкавіцкім заводзе замяніцеля цэльнага малака, Мазырскім малочным і Светлагорскім сыраробным заводах [18, арк. 193–195]. З ліпеня 1986 і па люты 1987 гг. у Чэрыкаўскім раёне Магілёўскай вобласці раённым КНК было праведзена 19 праверак. На 47,4 % правераных прадпрыемствах і арганізацыях выявілі парушэнні [19, арк. 4].

Прынящце адміністратыўных мер мела кароткачасовы эфект. Акрамя іх прымаліся і іншыя меры ўздзеяння. Выкарыстоўваўся патэнцыял культурна-асветніцкіх устаноў. Вялікая ўвага надавалася правядзенню мерапрыемстваў па прадухіленні правапарушэнняў праз сродкі масавай інфармацыі і прапаганды. Так, напрыклад, толькі за 1972 г. у Аршанскай мясцовай газеце «Ленінскі прызыў» было апублікавана 17 матэрыялаў па пытаннях аховы дзяржаўнай уласнасці, аб барацьбе з п’янствам і алкагалізмам. На тэмы аховы грамадскага парадку па мясцовым радыёвяшчанні адбылося 11 выступленняў. Было праведзена 537 выступленняў перад работнікамі працоўных калектываў [20, арк. 24].

Узмацненне кантролю з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва не прыводзіла ў стратэгічным плане да вырашэння праблем або выкаранення недахопаў, паколькі яны нярэдка мелі ўнутрана ўласцівыя савецкай сістэме кіравання прычыны, а іх рашэнне насіла ярка выражаны кампанейскі характар. Больш

эфектыўнымі паказалі сябе арганізацыйныя і адукацыйныя мерапрыемствы. Спробы эканамічнага стымулявання не давалі належнага эфекту з-за існаваўшых абмежаванняў і сістэмы размеркавання, дэфіцыту сацыяльных даброт і прадметаў шырокага спажывання.

1. Пушкін І. А., Агееў А. Р. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. Магілёў : БДУТ, 2022. 302 с. Вернуться к статье

2. Пушкин И. А. Неправомерные действия и злоупотребления служебным положением в советский период модернизации Беларуси, 1970–1991 гг. // Советский опыт: взгляд из XXI века (к 100-летию образования Союза Советских Социалистических Республик) : сб. ст. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. М. : Фонд «Историческая память», 2023. С. 328–345. Вернуться к статье

3. Пушкін І. А. Неправамерныя дзеянні пасадавых асоб Савецкай Беларусі ў 1970–1980-я гг. [Электронный ресурс] // Правовая культура в современном обществе : сб. науч. ст. / М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь» ; редкол.: И. А. Демидова (отв. ред.) [и др.]. Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2022. С. 519–524. Вернуться к статье

4. Протокол XVI Гродненской областной партийной конференции 18–19.12.1975 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці (ДАГАГр). Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1098. Вернуться к статье

5. Справка о состоянии общественного порядка за 9 месяцев 1976 г. (Витебская область) // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 176. Вернуться к статье

6. О серьезных недостатках в хозяйственной деятельности ПО «Бобруйскшина» : Решение КПК при ЦК КПСС от 20.04.1984 // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). Ф. 9. Воп. 178. Спр. 65. Вернуться к статье

7. Решение постоянной комиссии по социалистической законности и охране общественного порядка Гродненского областного совета народных депутатов от 2.07.1984 г. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГр). Ф. 1171. Воп. 5. Спр. 1136. Вернуться к статье

8. Справка Гродненского ПО молочной промышленности от 30.06.1984 г. // ДАГр. Ф. 1171. Воп. 5. Спр. 1136. Вернуться к статье

9. Резервы и возможности для успешного выполнения пятилетнего плана на 1971–1975 гг. промышленностью г. Орша // Занальны дзяржаўны архіў у г. Орша (ЗДАОрш). Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23. Вернуться к статье

10. Использование времени промышленно-производственных рабочих на предприятиях г. Новополоцка за 1970 г. // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацк. Ф. 1220. Воп. 1. Спр. 62. Вернуться к статье

11. Протокол заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 29.04.1972 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15. Вернуться к статье

12. Отчетный доклад о работе исполкома Оршанского городского совета депутатов. Май 1975 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Вернуться к статье

13. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Мінск : Соврем. шк. : Экоперспектива, 2011. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.). 728 с. Вернуться к статье

14. Справка о состоянии работы по подбору и расстановке кадров, исполнительской и трудовой дисциплины на предприятиях Витебского облместпрома (1989 г.) // ДАВц. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 189. Вернуться к статье

15. Информационная записка об организационно-массовой работе исполкома Октябрьского районного Совета депутатов трудящихся г. Могилева за 1972 г. // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Вернуться к статье

16. Отчет Гродненского областного комитета народного контроля за 1975 г. // ДАГр. Ф. 2407. Воп. 1. Спр. 505. Вернуться к статье

17. Протокол заседания бюро Гродненского ОК КПБ от 17.07.1980 г. // ДАГАГр. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1342. Вернуться к статье

18. Постановление Гомельского областного КНК от 25.01.1984 г. // Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 1682. Вернуться к статье

19. Информация Чериковского РК КНК от 24.02.1987 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 184. Спр. 72. Вернуться к статье

20. Докладная записка о состоянии общественного порядка и борьбы о преступностью в г. Орше за 1972 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 6а. Спр. 88. Вернуться к статье